Падтрымай "Вясну" на PATREON

Амаль 40 чалавек ужо выклікалі ў міліцыю для складання пратаколаў і прафілактычных гутарак дапоўнена

19.12.2019 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Мітынг 7 снежня ў Мінску.

На ўдзельнікаў акцый пратэсту супраць падпісання інтэграцыйных дакументаў з Расіяй, якія адбыліся ў Мінску 7 і 8 снежня, пачалі складаць пратаколы адміністрацыйных правапарушэнняў.

15 снежня на актывістку “Руху за Свабоду” і журналістку **Вольгу Быкоўскую**, якую выклікалі ў РУУС Ленінскага раёна Мінска, склалі пратакол правапарушэння па арт. 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве).

16 снежня раніцай пратакол па ч.1 арт 23.34 КаАП РБ (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве) быў складзены ў дачыненні да **Іллі Дабратвора**, які ў той дзень, 7 снежня, рабіў фотарэпартаж для электроннага выдання, з якім ён супрацоўнічае.

Ілля не пагадзіўся з пратаколам, у чым і зрабіў адзнаку ў дакуменце. Па-першае, у пратаколе было пазначана "прымаў актыўны ўдзел", але ў рапартах напісана, што "прысутнічаў". Не супадае і месца - у адным месцы плошча Незалежнасці, у іншым - Галоўпаштамт.

Па яго словах, у рапарце супрацоўнікаў міліцыі адзначаныя і іншыя прозвішчы актывістаў і ўдзельнікаў акцыі пратэсту. У прыватнасці, ён паспеў заўважыць прозвішчы **Дзяніса Красачкі, Леаніда Кулакова** і чалавека 1941 года нараджэння.

Па звестках праваабаронцаў, на 18 снежня выклікі ў РУУС Маскоўскага і Ленінскага раёнаў атрымалі ўжо 39 удзельнікаў акцыі:

Уладзімір Някляеў,

Валянцін Стэфановіч,

Ілля Дабратвор,

Вольга Быкоўская,

Ігар Лялькоў,

Алёна Янушкоўская,

Павел Севрынец,

Валер Рабцаў,

Вячаслаў Сіўчык,

Уладзімір Арлоў (пісьменнік),

Віталь Трыгубаў,

Мікалай Казлоў,

Пётр Маркелаў,

Іван Цуранкоў,

Дзяніс Юркевіч,

Мая Наўмава,

Віктар Савіч,

Андрэй Шарэнда,

Іларыён Трусаў (непоўнагадовы)**,**

Зміцер Марчук,

Зміцер Казлоў (блогер "Шэры кот"),

Вольга Кавалькова,

Віктар Кавалькоў (айцец Вікенцій),

Леанід Кулакоў,

Галіна Лагацкая,

Арсеній Дзядок (непоўнагадовы)

Андрэй Кудзік,

Аляксей Прохараў,

Павел Белавус,

Зміцер Казакевіч,

Антон Жылко,

Юрась Губарэвіч,

Дзяніс Красачка,

Мікола Бамбіза,

Наталля Ладуцька,

Уладзімір Неўмяржыцкі,

Мікіта Стружэўскі (непоўнагадовы),

Яўген Афнагель,

Пётр Садоўскі (былы дэпутат і першы амбасадар Беларусі ў Германіі),

Аляксей Марачкін,

Дзмітрый Кучук,

Пётр Рабушка,

Дзіна Мархаток,

Мікіта Бараўкоў (непоўнагадовы),

Міхась Варанцоў (выкліканы на прафілактычную размову),

Віктар Кулак (выкліканы на прафілактычную размову).

Акрамя таго, многіх удзельнікаў акцыі выклікаюць на гутаркі, каб папярэдзіць аб недапушчальнасці парушэння заканадаўства аб масавых мерапрыемствах.



Схамянуліся. Удзельнікаў шэсця 7 снежня масава выклікаюць у міліцыю, нават у нядзелю

Усё больш і больш беларусаў атрымліваюць позвы з'явіцца ў аддзяленні міліцыі для складання пратаколаў правапарушэнняў за ўдзел у мірных шэсцях 7 і 8 снежня супраць падпісання інтэграцыйных дакументаў з Расіяй.

У выпадку, калі Вас таксама выклікаюць у РУУС для складання пратаколу, а таксама па юрыдычную кансультацыю звяртайцеся ў грамадскую прыёмную ПЦ "Вясна":

- pierasled@spring96.org
- Моб.: (029) 841 39 81 (Signal, WhatsApp, Telegram)

Навіны ад Spring96.org у Telegram. Падпішыся на наш канал https://t.me/viasna96

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Дзень палітвязняў Беларусі. Да якіх мерапрыемстваў можна далучыцца?



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Патрабуем правясці расследаванне па факце смерці Мікалая Клімовіча і адсутнасці належнай медычнай дапамогі ў калоніях

Бацьку і дачку пакаралі "хатняй хіміяй" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Палітзняволенаму Яну Папковічу прысудзілі 4 гады калоніі

Сяржук Сыс – Валянціну Стэфановічу: "Ганаруся табой, тваёй воляй і характарам"

Праваабаронца і валанцёрка "Вясны" Марыя Тарасенка: "Я маю ўнікальную магчымасць падтрымліваць людзей"

"Яго місія ў большым. Яго мэта — нешта дасягнуць і даказаць": вязні шклоўскай калоніі пра Вітольда Ашурка

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

Радыё Свабода

Камунікат
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

Вытокі

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

СЯБРОЎСТВА

ENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY